ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 109 (1378) ПЯТНІЦА, 15 мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

За сотні новых фабзавучнікаў

Неабходзен ліпеньскі дадатковы набор

2200 новых фабзавучнікаў не забясьпечаць нашу прамысловасьць патрэбнымі кадрамі

Неабходна пасіліць тэмп капітальнага будаўніцтва ФЗВ, разгарнуць падрыхтоўку кадраў для ФЗВ, правесьці ўсебеларускі суботнік па дапамозе ФЗВ

Слова за ВСНГБ, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ!

За дадатковы ліпеньскі набор

Разгортваньне падрыхтоўкі кадраў—у дрэнным стане, што прымушае нас узьняць пытаньне аб максімальным форсаваньні гэтай работы.

Мы лічым неабходным правесьці ліпеньскі, дадатковы набор у школы ФЗВ.

Вясеньні набор у ФЗВ у асноўным закончаны. На папярэдніх зводках, 2200 падлеткаў уліліся ў сцены фабрычна-заводзкіх школ Беларусі. 2200 падлеткаў атрымаюць магчымасьць стаць за варштат, уладаць тэхнічнымі ведамі і авалодаць за прамфінплян.

Але гэтыя лічбы невыстарчальныя, яны не забясьпечваюць нашу прамысловасьць, якая шпарка расьце, патрэбнымі кадрамі.

У час асеньняга набору павінна быць набрана ў школы ФЗВ прыблізна 3 тысячы падлеткаў.

Нам добра памятна практыка арганізацыі і правядзеньня вясеньняга набору. Цяжкасьці пры правядзеньні гэтага набору тлумачацца непадрыхтаванасьцю, бясплянасьцю і цяганінай, якія назіраліся за ўвесь час падрыхтоўкі і правядзеньня набору.

Мы і зараз прымушаны констатаваць, што падрыхтоўка кадраў для фабзавучу разгорнута надзвычайна дрэнна. Сеткі курсаў па падрыхтоўцы патрэбнага для ФЗВ контынгенту амаль няма.

Усё гэта прымушае паставіць пытаньне аб тым, каб разгортваньне работы па падрыхтоўцы да набору пачаць зараз-жа.

Мы лічым, што вясеньні набор ня даў тых вынікаў якіх патрабуе сучасны пэрыяд. Падрыхтоўку кадраў неабходна фарсаваць як мага хутчэй.

Неабходна зрабіць дадатковы набор у школы ФЗВ, што палепшыць правядзеньне асеньняга набору і забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне вызначаных лічбаў.

Адначасова з падрыхтоўкаю набору неабходна максімальна форсаваць капітальнае будаўніцтва школ, для гэтага трэба скарыстаць летні час.

Капітальнае будаўніцтва знаходзіцца пад пагрозай. Мы падкрэсьліваем, што пры такой падрыхтоўцы да яго разгортваньня чарговы набор будзе напоўна сарваны.

Пастанова сакратарыяту ЦК ЛКСМБ, якую мы зьмяшчаем ніжэй, з усёй яскравасьцю сьцьвярджае той факт, што капітальнае будаўніцтва ФЗВ, замест яго форсаваньня і сапраўднага ажыцьцяўленьня яго першачарговасьці, пакінута на задворках, што тэмп разгортваньня капітальнага будаўніцтва не зможа забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне чарговых набораў.

Неабходна скарыстаць усе магчымасьці, мобілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, усю жыльлёвую плошчу, матар'ялы і варштаты для таго, каб забясьпечыць ня толькі выкананьне але перавыкананьне вызначаных лічбаў.

Будаўнічы комсамол павінен узяць пад свой догляд тэмп разгортваньня капітальнага будаўніцтва ФЗВ, ад пасьпяховага правядзеньня якога залежыць выкананьне плянаў чарговых набораў і забесьпячэньне прамысловасьці кадрамі.

Адначасова з гэтым, мы лічым, што неабходна правесьці ўсебеларускі суботнік дапамогі ФЗВ, які павінен даць значны штуршок у палепшаньні становішча фабзавучу: рамонт, абсталяваньне і г. д.

Пытаньнем ліпеньскага дадатковага набору ў школы ФЗВ павінны безадкладна заняцца ВСНГБ, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і зараз-жа сказаць аб гэтым свае слова.

Часу засталося зусім мала.

Слова за вамі!

115000 рублёў ляжаць мёртвым капіталам

Дырэкцыя і фабком Магілеўскай фабрыкі штучнага валакна зусім не цікавяцца падрыхтоўкаю кадраў.

У гадовым каштарысе адпушчана на пабудову школы ФЗВ 115 тысяч рублёў, якія да гэтага часу ляжаць мёртвым капіталам і не скарыстоўваюцца.

У гэты час школа знаходзіцца ў памяшканьні 4-хгодкі і ня мае патрэбных умоў для заняткаў і грамадзкае працы.

Школа павінна правесьці яшчэ дадатковы набор, але пры сучасным стане пляны набору не зможа выканаць.

Патрэбны рашучыя захады для таго, каб стварыць умовы для працы школы. Адпушчаныя сродкі павінны быць як мага хутчэй і больш рацыянальна скарыстаны.

Д. Рэзьнік

На перадавыя позыцыі коопэрацыйнага фронту

Далейшае падвышэньне рэальнай зарплаты і паленшаньне матар'яльнага становішча рабочае клясы і працоўных непарыўна зьвязаны з работай спажыўкоопэрацыі, якая зьяўляецца адным з важнейшых вагароў у справе ажыцьцяўленьня разгорнутай програмы соцыялістычнага будаўніцтва,

Таму зьмешчаная ў сёньняшнім нумары нашай газэты пастанова ураду, ЦК УсеКП(б) і Цэнтрасаюзу зьяўляецца адным з гістарычных рашэньняў у рабоце спажывецкай коопэрацыі. Гэтая пастанова—працяг далейшага разьвіцьця рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб рабоце спажыўкоопэрацыі, якая ня гледзячы на рад дадатных бакоў яшчэ не перабудавалася адпаведна з задачамі рэконструкцыйнага пэрыяду.

Гэтая пастанова адкрывае вялікае поле дзейнасьці для комсамольскіх ячэек і кожнага комсамольца паасобку.

Мы маем цэлы рад фактаў, калі паасобныя комсамольскія колектывы, ячэйкі паказалі сапраўдныя ўзоры дапамогі коопэрацыі ў наладжваньні сваёй работы. Нашым чытачом вядомы факты, калі комсамольцы Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату ўзялі шэфства над рабочай сталоўкай; калі ў Менску, Віцебску і Гомелі організоўваліся і працуюць комсамольскія коопэратывы, якія прымаюць вялізарны ўдзел у рабочым забясьпечаньні. Нарэшце трэба падкрэсьліць работу спэцыялізаванай брыгады „Чырвонай Зьмены“, якая сумесна з комсамольскай організацыяй Гомельшчыны больш месяцу дапамагала ліквідаваць прарывы у падрыхтоўцы да слубы у саўгасах Гомельскага ЦРК.

Аднак падобных фактаў зусім мала, мы можам іх пералічыць па пальцах.

Пастанова ЦК УсеКП(б) прадугледжвае вялізарную колькасьць кадраў для спажыўкоопэрацыі.

„Калі гаварыць проста, дык трэба з коопэрацыі выгнаць ня менш паловы коопэратараў і замяніць іх новымі, якія-б былі зьвязаны з рабочымі масамі—добрымі партыйцамі і комсамольцамі“,—так заявіў тав. Кагановіч у сваім дакладзе аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) на сходзе Маскоўскай парторганізацыі.

Комсамол БССР павінен забясьпечыць вылучэньне лепшых комсамольцаў на актыўную работу у коопэрацыі. Даць лепшых комсамольцаў для замены бюрократычнага і клясава-варожага элемэнту якога шмат яшчэ у спажыўкоопэрацыі,

Комсамольскія ячэйкі павінны ўзяць пад свой кантроль выкананьне рашэньняў ураду і партыі аб рабоце коопэрацыі, сыстэму падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, Трэба прыцягнуць комсамольцаў да працы коопэрацыйных камісій, павялічыць колькасьць абраных комсамольцаў у праўленьні закрытых разьмеркавальнікаў ЦРК і г. д.

Комсамол павінен паказаць лепшыя узоры работы на фронце спажывецкай коопэрацыі.

Пастанова СНК, ЦК УсеКП(б) і Цэнтрасаюзу павінна зараз-жа быць даведзена да комсамольскіх мас і пераключана на мову конкрэтнай работы.

Школа „КІМу“ без інтэрнату

Інтэрнат фабрыкі-школы імя "КІМ" (Менск) знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы. Вучням з дзіцячых дамоў ня створаны самыя неабходныя ўмовы для жыцьця. Ніякай культурнай работы сярод інтэрнатаўцаў не праводзіцца.

У вініку многія выхаванцы дзетдамоў пакінулі школы, а некаторыя зараз імкнуцца ўцячы.

Буйнейшая ў БССР школа павінна мець лепш абсталяваныя інтэрнаты.

Інтэрнатавец Пархімчык

Не наладжана праца

У ФЗВ чыгуначнікаў станцыі Віцебск МББ дрэнна наладжана выхаваўчая праца і падыход да навучаньня вучняў.

Вельмі часта, калі вучням цяжка надаюцца паасобныя працэсы вытворчасьці, ім не ствараюць умовы для вучобы, а выкідаюць са школы. Такіх прыкладаў было багата.

Рабочыя дэпо абураны такой пастаноўкаю вучобы.

Рабочы дэпо

Не дапускаць зрыву капітальнага будаўніцтва ФЗВ

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб становішчы капітальнага будаўніцтва школ ФЗУ у 1931 г.

Заслухаўшы даклад ВСНГБ аб становішчы капітальнага будаўніцтва школ ФЗВ у 1931 г., бюро ЦК ЛКСМБ констатуе, што сучаснае становішча школ ФЗВ, у сэнсе забясьпечаньня памяшканьнем, недапушчальна дрэннае (ФЗВ заводу „Рухавік рэволюцыі“ ня мае вуч. памяшканьняў і інтэрнату, Менскі ФЗВ друкароў з-за адсутнасьці памяшканьня не працуе і інш.) і зьяўляецца простай перашкодай для далейшага разгортваньня будаўніцтва фабзавучаў.

Бюро ЦК адзначае, што падрыхтоўка да будаўніцтва памяшканьняў для ФЗВ вядзецца недапушчальна марудннымі тэмпамі і ня забясьпечвае выкананьня дырэктыў партыі і ўраду.

Выходзячы з вышэй адзначанага, Бюро ЦК ЛКСМБ лічыць неабходным:

1. Адзначаючы значынную бязьдзейнасьць гаспадарчых організацый і ВСНГ у справе капітальнага будаўніцтва, лічыць капітальнае будаўніцтва школ ФЗВ у 1931 годзе на палову сарваным.

Пацьвердзіць папярэднюю пастанову Бюро ЦК ад 14/II-31 г. аб тым, што аддзел кадраў ВСНГ ня здолеў забясьпечыць своечасовае і поўнае правядзеньне будаўніцтва школ ФЗВ.

У другі раз прасіць ЦКК КП(б)Б тэрмінова разгледзець пытаньне аб капітальным будаўніцтве фабзавучаў.

2. Улічваючы, што асыгнаваныя на капітальнае будаўніцтва школ ФЗВ сродкі (915 тысяч), з адпушчаных 3.150.000 па лініі ВСНГ на будаўніцтва навучальных установ менш чым напалову здавальняюць патрэбнасьць фабзавучаў у памяшканьнях, тады як ВТНУ і тэхнікумы будуць здаволены поўнасьцю,— лічыць разьмеркаваньне сродкаў ня правільным. Прасіць СНК БССР перагледзець разьмеркаваньне сродкаў на будаўніцтва навучальных установ па лініі ВСНГБ, з метай павялічыць асыгнаваньні на будаўніцтва школ ФЗВ з такім разьлікам, каб забясьпечыць ня менш 60 проц. патрэбнасьці будаўніцтва об'ектаў ФЗВ.

3. Лічыць неабходным у пляне будаўніцтва школ ФЗВ 1931 году дадаткова ўключыць пабудову фабзавучу пры машына-будаўнічым заводзе імя Варашылава.

4. Адзначыць, што запісаная прэзыдыумам ВСНГБ пазачарговасьць капітальнага будаўніцтва школ ФЗВ у 1931 г. па прыкладу мінулага году не забясьпечвае сапраўднае першачарговасьці будаўніцтва і далей паперныя справы не пайшла. Аб гэтым сьведчаць адсутнасьць сродкаў і буд. матар'ялаў на будаўніцтва ФЗВ і простае адцягваньне яго. Пастанова прэзыдыуму ВСНГБ аб пазачарговасьці будаўніцтва ФЗВ яшчэ не даведзена да аб'яднаньняў і прадпрыемстваў.

Прасіць Дзяржплян БССР вызначыць пазачарговасьць будаўніцтва памяшканьняў фабзавучаў, абгаварыўшы тэрмін пабудовы вуч. корпусу да 15-га жніўня і інтэрнатаў да 1-га верасьня, а таксама даць цьвёрдыя разнарадкі на будаўнічыя матар'ялы (цэмант і інш.). Даручыць тав. Рубінчыку гэта пытаньне ўнесьці ў Дзяржплян.

Лічыць мэтазгодным ускласьці адказнасьць за будаўніцтва памяшканьняў для школ ФЗВ на загадчыкаў фабзавучаў і на дырэктароў прадпрыемстваў, пры якіх знаходзяцца фабзавучы.

5. Лічыць неабходным уключыцца ва ўсесаюзны конкурс будаўніцтва ФЗВ. Увайсьці з хадайніцтвам у ЦВК БССР аб стварэньні пры гарсаветах і райвыканкомах грамадзкіх саветаў па кантролю за пабудовамі фабзавучаў. Саветы павінны складацца з прадстаўнікоў гарсавету ці райвыканкому, гарпрофсавету, камітэту комсамолу, рабочых ударнікаў і гаспадарнікаў,

6. Бязьдзейнасьць райкомаў і гаркомаў комсамолу у галіне кантролю за капітальным будаўніцтвам фабзавучаў зьяўляецца таксама адной з прычын марудных тэмпаў будаўніцтва. Адзначаючы невыкананьне гомельскім, менскім, віцебскім, бабруйскім гаркомамі і райкамамі дырэктывы ЦК ЛКСМБ ад 14-II аб капітальным будаўніцтве, прапанаваць ім наладзіць кантроль і дапамогу будаўніцтву фабзавучаў, кіруючыся раней дадзенай дырэктывай ЦК ЛКСМБ,

7. Прасіць ЦК УсеЛКСМ паставіць пытаньне перад адпаведнымі органамі аб вылучэньні цэманту з саюзных фондаў для патрэб капітальнага будаўніцтва ФЗВ, бо недахоп цэманту ставіць пад пагрозу зрыву сёлетняе будаўніцтва школ.

Даручыць аддзелу эдукацыі і быту напісаць дакладную запіску ў ЦК УсеЛКСМ.

8. Прасіць Камісію Выкананьня пры СНК БССР разгледзець пытаньне аб выкананьні пастаноў партыі і ўраду аб капітальным будаўніцтве ФЗВ.

9. Пастанову надрукаваць у „Чырвонай Зьмене“

Тэлеграма ЦК ЛКСМБ усім гаркомам і райкомам ЛКСМБ

Сэкратарыятам ЦК ЛКСМБ адзначана, што мобілізацыя комсамольцаў на дорбудаўніцтва зрываецца. За зрыў мобілізацыі перададзены ў ЦКК сэкратары райкамолаў: Бабруйскага, Бягомльскага, Сьмілавіцкага. Прапануецца закончыць мобілізацыю 25 мая і аб выніках паведаміць. За невыкананьне пастановы, вінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Па даручэньню сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ Юрк'янец.

АБ СПАЖЫВЕЦКАЙ КООПЭРАЦЫІ

Усім партыйным, савецкім, гаспадарчым, коопэрацыйным, профсаюзным і комсамольскім арганізацы

Сур'ёзьнейшая роля спажкоопэрацыі ў справе ажыцьцяўленьня народнагаспадарчага пляну трэцяга году пяцігодкі, гіганцкі рост таваразвароту краіны і вялікая ўдзельная вага коопэрацыйнай тавараправодзячай сеткі пры адсталасьці і бюрократычнасьці коопэрацыйных органаў патрабуюць перабудовы работы спажкоопэрацыі на новых пачатках.

Асноўным недахопам у цяперашняй рабоце спажкоопэрацыі зьяўляюцца непаваротнасьць і бюрократызм у рабоце, якія вядуць да замарожваньня таваразвароту, з прычыны чаго нярэдка штучна ствараецца беставар'е пры значным павялічэньні таварных рэштак на складах.

Гэтыя недахопы ў рабоце спажкоопэрацыі тлумачацца галоўным чынам тым, што, выцесьніўшы прыватніка і заняўшы манапольнае становішча на рынку, спажкоопэрацыя стала пагарджаць прынцыпам гаспадарчага разрахунку і задачай разгортваньня савецкага гандлю, памылкова прапалажыўшы, што ўжо насьпелі ўмовы для непасрэднага пераходу да простага продуктаабмену. Пры гэтым спажкоопэрацыя забылася, што выцясьненьне прыватніка і прыватнага гандлю яшчэ не азначае зьнішчэньня ўсякага гандлю, што, наадварот, выцясьненьне прыватнага гандлю мяркуе ўсямернае разьвіцьцё савецкага гандлю і разгортваньне сеткі коопэрацыйных і дзяржаўных гандлёвых арганізацый па ўсім СССР.

На падставе гэтых памылак узьнікла аслабленьне прынцыпу выбарчасьці нізавых зьвеньняў спажкоопэрацыі і адрыў коопэрацыі ад сваёй масавай базы, што не магло ня прывесьці да ўзмацненьня бескантрольнасьці апарату, ігнараваньня запатрабаваньняў спажыўцоў і сыстэмы „абязьлічанага гандлю", г. з. завозу і продажу тавараў бяз уліку асаблівасьцяй раёнаў СССР і запатрабаваньняў іх насельніцтва.

У мэтах зьнішчэньня гэтых недахопаў і перабудовы работы спажкоопэрацыі на новых пачатках, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Цэнтрасаюз прапануюць правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы:

I.

Раздробны і гуртавы гандаль спажкоопэрацыі

У мэтах лепшага абслугоўваньня спажыўца, спрашчэньня кіраўніцтва справай забясьпечаньня спажыўца, паскораньня таваразвароту і спэцыялізацыі кіраўніцтва гандлёвай сеткай стварыць пры Цэнтрасаюзе гуртавыя, галіновыя, усесаюзныя аб'яднаньні, якія дзейнічаюць на падставе гаспадарчага разрахунку па наступных групах тавараў: а) гатовая вопратка; б) галёшы, абутак і скураныя тавары; в) галянтарэя, трыкатаж, гатовая бялізна; г) мануфактурна-суконна-ваўняныя вырабы; д) тавары па культурнаму абслугоўваньню; е) сілікатныя вырабы; ж) скабяныя вырабы; з) вырабы саматужнай прамысловасьці; і) бакалейна-гастраномічныя тавары; к) плодагародніна (з функцыямі загатоўча-забясьпечваючымі); л) малочныя продукты (з функцыямі загатоўча-забясьпечваючымі); а Цэнтрасаюз перабудаваць па тыпе ВСНГ і яго прэзыдыуму.

У рэспубліках, краёх і абласьцях стварыць рэспубліканскія, краёвыя і абласныя аб'яднаньні раздробнага гандлю па вышэйпералічаных групах тавараў з дапаўненьнем аб'яднаньняў па наступных групах тавараў: а) мэблевыя вырабы, б) мяса, птушка; в) цукерныя вырабы; г) дзіцячага забясьпечэньня.

УВАГА. У тых выпадках, калі ў паасобных гарадох па наяўнасьці гандлёвай сеткі ці нязначнасьці таваразвароту вылучэньне спэцыялізаванай тавараправодзячай сеткі па ўсіх пералічаных відах тавараў зьяўляецца нямэтазгодным, дапушчаць арганізацыю комбінаванай сеткі па продажу розных тавараў, па магчымасьці аднародных.

Для кіраваньня галінавымі аб'яднаньнямі стварыць дырэкцыі, якія назначаюцца і зацьвярджаюцца па гуртавых аб'яднаньнях—прэзыдыумам Цэнтрасаюзу, па раздробных—прэзыдыумамі рэспубліканскіх, краёвых і абласных спажсаюзаў.

Рэспубліканскім, краёвым і абласным галінавым аб'яднаньням перадаць усе спэцыялізаваныя магазыны спажывецкай коопэрацыі па паказаных групах тавараў з абавязацельствам організацыі пры кожным аб'яднаньні складачнатарна-транспортнай гаспадаркі.

Прапанаваць Цэнтрасаюзу стварыць у рэспубліках, краёх і абласьцёх гуртавыя склады, а ВСНГ—перадаць Цэнтрасаюзу рад базавых складаў, якія нямаюць непасрэднай сувязі з прадпрыемствамі. ВСНГ і Цэнтрасаюзу ў 2-хдэкадны тэрмін паведаміць у СПА аб колькасьці складаў, якія перадаюцца, і аб умовах іх перадачы.

2. Скасаваць практыку нормаваньня продажу прамтавараў, устанавіўшы часова толькі для паасобных, найбольш дэфіцытных тавараў, норму водпуску ў адны рукі.

Скасаваць практыку браніяваньня прамтавараў (за выключэньнем браніяваньня прамтавараў па опэрацыях: лесараспрацоўкі, лесасплаў, пуціна, загатоўкі—пушніны, яек і масла) і продажу іх па ордэрах, захаваўшы часова водпуск па ордэрах толькі для вопраткі (гарнітуры, польты) і абутку, з устанаўленьнем тэрміну дзеяньня ордэраў (10 дзён).

3. Устанаўляючы, што галоўная маса тавараў здабываецца праз коопэрацыйную раздробную сетку, вызначыць удзел дзяржаўнага раздробнага гандлю ў разьмеры ня больш 30 проц. усіх фондаў гаразкога гандлю, дапускаючы з дазволу СПА ў паасобных гарадох павышэньне ўдзельнай вагі дзяржгандлю да 35 проц.

4. Прапанаваць Цэнтрасаюзу прыняць усе неабходныя меры да таго, каб да восені гэтага году былі адкрыты новыя магазыны прадметаў харчаваньня (хлеб, мяса, птушка, рыба, гародніна, малочныя продукты, фрукты) у колькасьці ня менш 200 у Маскве, ня менш як па 150 у Ленінградзе і Донбасе, ня менш як па 100 у Харкаве, Кіеве, Растове, Баку, Ніжнем-Ноўгарадзе, Іванава - Вазьнясенску, Тыфлісе, Сталінградзе, Сьвярдлоўску, Адэсе і Ташкенце і ня менш як па 80 у іншых буйных гарадох і прамысловых цэнтрах СССР.

5. Цэнтрасаюзу, ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Забясьпечаньня аднавіць сыстэму папярэдніх заказаў спажкоопэрацыі прамысловасьці.

II

Вытворчыя прадпрыемствы спажкоопэрацыі

1. Стварыць у сыстэме спажкоопэрацыі вытворчыя аб'яднаньні па наступных галінах:

а) буйныя мэханізаваныя хлебапякарні і хлебазаводы з аб'яднаньнем іх у спэцыяльныя трэсты пры абласных, краёвых і рэспубліканскіх саюзах спажкоопэрацыі і з уваходжаньнем іх ва ўсесаюзнае аб'яднаньне хлебапячэньня пры Цэнтрасаюзе;

б) буйныя гародныя, сьвінагадоўчыя, малочныя і птушніцкія гаспадаркі спажкоопэрацыі, якія маюць абласное, агульнагарадзкое ці міжкраённае значэньне, з організацыяй іх у самастойныя гаспадарчыя аб'яднаньні пры рэспубліканскіх, краёвых і абласных саюзах і з забясьпечаньнем удзелу ў іх мясцовага савету і профсаюзаў.

2. Для разгрузкі спажкоопэрацыі ад неўласьцівых ёй функцый перадаць ад коопэрацыі;

а) прамысловасьць—Народнаму Камісарыяту Забясьпечаньня (акрамя прадпрыемстваў дробнага поўсаматужнага тыпу: вытворства мінэральных вод, пераапрацоўка розных харчовых адыходаў ад гандлю і інш.);

б) цырульні і пашывачныя майстэрні—сампрамкоопэрацыі;

в) пральні—гарсаветам.

Перадачу, як прамысловых прадпрыемстваў, так і праленьняў, цырулень і пашывачных майстэрань правесьці з компэнсацыяй коопэрацыі па адпаведных разрахунках;

г) культурнае абслугоўваньне (кінопересоўкі, радыё, бібліотэкі) – Саюзкіно, НКАсьветы, Наркомпаштэлю; дзіцячыя ўстановы—органам НК Аховы Здароўя і НКАсьветы з захаваньнем адпаведных адлічэньняў коопэрацыі на культабслугоўваньне сваіх пайшчыкаў.

III

Загатоўчая дзейнасьць спажкоопэрацыі

1. НК Забясьпечаньня сумесна з Цэнтрасаюзам вызначыць віды загатовак, па якіх спажкоопэрацыя павінна зьяўляцца асноўным загатоўцаю для данай вобласьці (краю, рэспублікі).

2. У мэтах устанаўленьня непасрэднай сувязі паміж буйнымі прамысловымі цэнтрамі і выпрабляючымі раёнамі дапусьціць ЦРК, „ТПО" і закрытыя рабочыя коопэратывы гэтых цэнтраў да загатовак гародніны і малочных продуктаў як унутры вобласьці (краю, рэспублікі), так і ў раёнах іншых абласьцей (краёў, рэспублік) пад кантролем органаў НК Забясьпечаньня.

3. Гародніну і малочныя продукты, якія загатаўляюцца спажкоопэрацыяй для мясцовага забясьпечаньня, скарыстаць апошняй непасрэдна без якіх-бы там ні было нацэнак на гэтыя загатоўкі з боку органаў НК Забясьпечаньня.

4. У мэтах стымуляваньня справы адкорму сьвіней пры сталоўках, заводзкіх коопэратывах і інш. нізавых зьвеньнях спажкоопэрацыі—лічыць неабходным замацаваньне за імі ўсёй продукцыі, якая атрымліваецца ад сьвінаадкормачных пунктаў з тым, каб 50 проц. гэтай продукцыі ішлі ў якасьці дадатковага забясьпечаньня данага прадпрыемства звыш пляну.

IV

Аўтаномныя сэкцыі ў сыстэме спажывецкай коопэрацыі

1. Вызначыць грамадзкае харчаваньне ў самастойную сэкцыю ў сыстэме спажывецкай коопэрацыі з асобным паявым капіталам і балянсам, перадаўшы ёй аб'яднаньне „Всенарпит".

2. Прапанаваць Цэнтрасаюзу неадкладна прыступіць да організацыі, па прыкладу чыгуначнай і воднай коопэрацыі, наступных аўтономных коопэрацыйных сэкцый: а) рыбалавецкай, б) лесараспрацовак і лесасплаву, в) торфараспрацовак.

V

Зарплата

1. Павысіць зарплату работнікам спажывецкай коопэрацыі і ўвесьці сыстэму заахвочваньня аплаты працы шляхам устанаўленьня зарплаты ў процантах ад звароту.

2. Увесьці ў сыстэму прэміяваньня за перавыкананьне якасных паказчыкаў гандальфінпляну, паскораньне таваразвароту, зьніжэньне натуральнае страты і страт тавараў, скарочаньне гандлёва арганізацыйных выдаткаў, выкананьне і перавыкананьне пляну па зборы паявых узносаў, укладаў, авансаў і коопэраваньні насельніцтв .

Гэтыя мерапрыемствы павінны быць ажыцьцёўлены па гарадзкой раздробнай сетцы Масквы, Ленінграда, Харкава і Донбасу да 15 мая, па ўсёй сыстэме спажывецкай коопэрацыі—да 15 жніўня 1931 году,

3, Прапанаваць Цэнтрасаюзу разам з ЦК саюзу работнікаў коопэрацыі і дзяржаўнага гандлю ў месячны тэрмін распрацаваць сыстэму аплаты работнікаў сельскай спажывецкай коопэрацыі.

VI

Кадры спажывецкай коопэрацыі

Цэнтрасаюзу разгарнуць у 1931 годзе кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы ня менш 150.000 работнікаў (заг. магазынамі, заг. аддзяленьнямі, прадаўцоў, работнікаў грамадзкага харчаваньня, заг. сталоўкамі, кухараў, работнікаў па хлебапячэньню, а іменна: брыгадзіраў, организатараў і пекараў, работнікаў прыгараднай гаспадаркі, а іменна: агароднікаў, заг. адкормачнымі пунктамі, малочнымі фэрмамі і інш. рахункаводных работнікаў).

VII

Аб рабоце партыйных і профэсыянальных організацый у магазынах і складах

1. Для пасьпяховага ажыцьцяўленьня пастаўленых перад коопэрацыйнымі організацыямі задач і ўзмацнен партыйнага ўплыву ва ўсіх зьвен спажывецкай коопэрацыі стварыць кожным ЗРК цэхавыя парт'ячэй партгрупамі ў кожнай паасобнай падарчай адзінцы (сталоўка, мага фэрма і інш.), якія ўваходзяць у ск парторганізацыі прадпрыемства. прадпрыемствах, якія ня маюць З організаваць парт'ячэйкі пры зак тых разьмеркавальніках. Пры буйных і сярэдніх магазынах і ск дах усёй іншай сеткі спажывец коопэрацыі організаваць самастой партыйныя і комсамольскія ячэ падпарадкаваныя непасрэдна райк ці гаркому партыі.

2. У найкарацейшы тэрмін пераг дзець сетку профсаюзных органаў опэрацыі з тым, каб ахапіць імі ко ны харчовы магазын, склад, базу і г. падпарадкаваўшы іх кіраўніцтву ад ведных раённых ці абласных проф ганізацый. Пры кожным ЗРК орга заваць самастойны мясцком з про групамі пры паасобных гаспадарч адзінках, дабіваючыся максімальн ахопу профсаюзным членствам коо рацыйных работнікаў.

ЦК партыі, СНК Саюзу ССР і Ц трасаюз не сумняваюцца, што мясц выя партыйныя, профэсыянальн коопэрацыйныя, комсамольскія і с вецкія организацыі прымуць усе мер да таго, каб гэта пастанова была в канана дакладна і неадкладна.

Старшыня СНК Саюзу СС
В. Молатаў (Скрабін).

Сэкратар ЦК УсеКП(б) І. Сталін.

Старшыня Цэнтрасаюзу І. Зяленскі.

БЕЗ ПАРТЫЙНАГА РУЛЯ

Ячэйкі ЛКСМБ Віцебскага вузла працуюць без кіраўніцтва партыйных ячэек

Да партыйнай адказнасьці тых, хто ігнаруе комсамол

Абураючыя факты ігнараваньня комсамолу

З часу адозвы ЦК і СНК аб аздараўленьні транспорту пытаньне аб рабоце комсамолу Віцебскага вузла ня толькі не стаяла на парт колектыве і ячэйках спэцыяльна, але акрамя комсамольскіх кіраўнікоў ніхто аб этым і не гаварыў, нават пры абмеркаваньні якога-небудзь пытаньня аб комсамоле.

Ячэйка № 8 чыгуначнага вузла ў сваёй рабоце мае рад буйнейшых прарываў. Бюро колектыву адзначыла у яе рабоце права-опортуністычную практыку. Бязумоўна, у гэтым вінавата і партячэйка, пад кіраўніцтвам якое знаходзіцца ячэйка № 8. Ёсьць факты. Калі бывала сэкратар комсамольскай ячэйкі зьвяртаўся ў партыйную ячэйку з якім-небудзь пытаньнем, дык сэкратар партыйнай ячэйкі адказваў: „Некалі мне вамі займацца, у мяне ёсьць іншая работа".

Большасьць комуністых - комсамольцаў недапушчальна адносіцца да комсамольскай работы. Сэкратар комсамольскага колектыву прасіў паркамітэт прыняць да іх адпаведныя меры. Сэкратар паркамітэту т. Іўра заявіў на гэта—: „Чаму мы павінны ўзьдзейнічаць? Што-ж вы зрабілі па комсамольскай лініі (?!) і тут-жа „параіў" выключыць комсамольцаў-партыйцаў з комсамолу

У выніку такіх адносін партыйных кіраўнікоў да комсамольскай работы 70 проц. партыйцаў-комсамольцаў вузла ніякага ўдзелу ня прымаюць у рабоце комсамольскага колектыву.

Частка партыйцаў недаацэньвае ролі комсамолу як памочніка партыі ня гледзячы на тое, што комсамольскія ячэйкі падаюць добрыя ўзоры барацьбы за перабудову транспорту: 12 комсамольскіх брыгад, вузла цалком сябе апраўдваюць 80 проц. комсамольцаў ахоплены соцспаборніцтвам. Комсамольскі паравоз імя „Чырвонай Зьмены" да пераходу на спараную язду выкарыстоўвауся выключна на манэўрах а зараз— для тавара-пасажырскіх цягнікоў.

Паравоз мае перабегі і экономію апалу.

Ад прамыўкі да прамыўкі машына ня бывае ў дэпо,

Комсамольская каце, льная і кандуктарская—лепшыя ў дэпо.

Комсамольцы першыя зьніжалі ў цэхох расцэнкі, першыя ўзяліся за аўладаньне тэхнікай.

За красавік і сакавік месяцы організацыя вырасла на 130 чалавек.

Але-ж недаацэнка ролі комсамолу адсутнасьць патрэбнага кіраўніцтва прыводзяць да таго, што паасобныя парт. і профкіраўнікі (Стронін, Куракоў) заяўляюць;—Комсамол—пустое месца на вузьле"

Ня дзіва, што ў насьценгазеце кандуктарскага цэху зьмешчаецца вершаваная заметка пад загалоўкам „Трапачы". Комсамольцы-ўдарнікі і цалкам ўся ячэйка абзываюцца ў вершы „трапачамі". „пустабрэхамі" „пустазвонамі". Карацей кажучы, мы маем самае ад'яўленае выступленьне супроць ударных брыгад.

Цяперашні сэкратар партколектыву тав. Гвоздзеў лічыць гэта— „бязумоўна правільным"

Брыгадзір.

Там, дзе няма належнага парткіраўніцтва

Ужо ня раз адзначалася слабая работа паасобных комсамольскіх вясковых ячэек Віцебскага раёну. Прычыны гэтага ня ў тым, што комсамольцы не працаздольныя, а галоўным чынам у тым, што няма належнага кіраўніцтва з боку Гаркамолу і, у асаблівасьці, партыйных ячэек.

Так, ячэйка пры санаторыі „Сасноўка" налічвае 11 комсамольцаў пры наяўнасьці ў два разы большай партыйнай ячэйкі. Здавалася-б, што парткіраўніцтва гэтай ячэйкі пастаўлена добра, але на справе выходзіць інакш. Калі сэкратар ячэйкі ЛКСМБ зьвярнуўся раз да партыйца з просьбай аказаць дапамогу ў працы комсамольскай ячэйкі, дык партыец адказаў: „з саплівымі хлапчукамі ня хочу мець справы". Ясна, што ад такіх партыйцаў правільнага парткіраўніцтва чакаць нельга.

Такія хворыя адносіны партыйцаў да комсамольскіх ячэек ня рэдкі. Возьмем, напрыклад, ячэйку саўгасу „Цераспаль", пры якім ёсьць аддзяленьне колгасу „Іскра Віцебская". Гэты колгас разваліўся дзякуючы опортуністычнаму ўчынку 4-х комсамольцаў, якія на чале з сэкратаром комсамольскай ячэйкі, выступілі з колгасу. Дзе-ж была партячэйка саўгасу, дапусьціўшы такі ганебны факт? За факт развалу колгасу партячэйка нясе ў два разы больш адказнасьці, хоць гэта ні ў якім разе ня зьнімае адказнасьці і з комсамольскай ячэйкі.

Факты з ячэйкі вапнянага заводу таксама сьведчаць аб тым, што няма належнай спайкі ў рабоце паміж комсамольскай і партыйнай ячэйкамі. Сэкратар партячэйкі лае комсамольскую за дрэнную працу, а сэкратар комсамольскай ячэйкі—партыйную за адсутнасьць дапамогі ў рабоце.

Вышэйпаданыя факты прымушаюць нас біць трывогу. Трэба дабіцца пералому ў парткіраўніцтве комсамольскімі ячэйкамі.

Вясковы

Да ўсіх падаўшых заявы ў вайскова-морскія навучальныя ўстановы

Вайсковы аддзел ЦК ЛКСМБ паведамляе, што іспыты пачнуц 16-га чэрвеня г. г. у Ленінградзе, а таму ўсім падаўшым заявы тра зьявіцца ў школу.

Атрымаўшым пасьведчаньні Ваенкамат забясьпечвае праезд, аста нія едуць за свой кошт.

Загадчык вайсковага аддзелу ЦК ЛКСМБ Гузікаў

На аванпосты ўсесаюзнай ільнянай пераклічкі

Комсамол ільнаводных раёнаў БССР! Твая баявая програма—

дацьць 240 тысяч га лёну, 40 тысяч га канапель, фарсаваць тэмпы будаўніцтва 46-ці ільнаапрацоўчых заводаў

Сустрэчным плянам, конкрэтным плянам спэцыялізаваных удараў, праз спаборніцтва і ўдарніцтва, забясьпечым выкананьне бальшавіцкай програмы

Адозва друку Заходняй і Ленінградзкай абласьцей да ўсіх ільнаводчых раёнаў

Вырашэньне проблемы тэхнічных культур, а тым самым і стварэньне патрэбнай сыравіннай базы для лёгкай індустрыі, якая абслугоўвае патрэбы прамысловасьці і ўзрастаючыя патрэбы шырокіх мас працоўных, зьяўляюцца у сучасны момант побач з проблемай жывёлагадоўлі прадметам асаблівай ўвагі і клопатаў усёй партыі, усёй пролетарскай дзяржавы.

Бурныя тэмпы колектывізацыі, падвядзеньне пад ільнаводчую гаспадарку магутнай тэхнічнай базы, прынятая ўрадам і ЦК партыі разгорнутая програма, якая пасьпяхова ажыцьцяўляецца, індустрыялізацыя ільнаводства ў выглядзе стварэньня МТС на ўсіх асноўных ільнаводчых раёнах, будаўніцтва заводаў першапачатковай апрацоўкі лёну, завозу ільнаперабілак, шырокага укараненьня мінэральных угнаеньняў— усё гэта адкрывае ўпяршыню сапраўды шырокія пэрспэктывы развіцьця ільнаводства як ў часе засваеньня новых вялізарных плошчаў пад лён, так і росту ўраджайнасьці і ўздыму тэхнікі ільнаводства на вышыню, якая цалкам адпавядае настаўленай партыяй і ўрадам задачы—„дагнаць, максімум за дзесяць год, самыя перадавыя ў тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя краіны". [illegible] дачы прыпадае на долю Заходняй, Ленінградзкай, Іванава-Вазьнясенскай, Ніжагародзкай, Маскоўскай, Уральскай абласьцей, Заходне-Сібірскага краю і Беларусі.

У ажыцьцяўленьні гэтай баявой задачы рашаючую ролю павінна адыграць шырокае разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва, як асноўнага мэтаду шкодзёнай барацьбы за масавы ўздым усіх арганізацый, і мобілізацыя шматмільённых мас ільнаводаў колгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Заходняя вобласьць—асноўная ільнаводчая база Савецкага Саюзу—якая пашырае ў гэтую вясну свой ільняны клін на 45,6 проц. і даводзіць пасеўную плошчу пад лён да 560.000 гектараў, у асобе яе абласных газэт: „Рабочий путь", „Социалистическая деревня", „Большевистский молодняк", „Областная радио-газета" і раённай газэты Вязьмічыны „Большевистский путь",—выклікала на ільняную пераклічку сумежную з ёй Ленінградзкую вобласьць, якая зьяўляецца па размерах сваіх ільняных плошчаў (237.000 гект.), па выхаду таварнай продукцыі і па якасьці лёну другой ільнаводчай вобласьцю ў СССР.

Узаемна ўключаючыся ў гэту пераклічку і сабраўшыся ў Ленінградзе ў рэдакцыі „Ленинградской правды" для распрацоўкі канкрэтнай баявой програмы дзеяньняў у барацьбе за лён, прадстаўнікі абласных газэт Заходняй вобласьці і абласных газэт Ленінградзкай вобласьці, пры ўдзеле прадстаўнікоў абласных арганізацый абедзьвюх абласьцей і прадстаўнікоў колгасаў ільнаводчых раёнаў Заходняй вобласьці, лічаць неабходным перарабіць гэту пераклічку дзьвюх абласьцей ва „усесаюзную ільняную пераклічку" усіх ільнаводчых раёнаў Саюзу, для таго, каб злучанымі намаганьнямі друку і арганізацый ільнаводчых раёнаў, на аснове соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, з найбольшым посьпехам і ў найкарацейшыя тэрміны дабіцца вырашэньня проблемы лёну ў поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі.

Мы, абласныя газэты Заходняй і Ленінградзкай абласьцей, выклікаем абласныя газэты Масквы, Іванава-Вазьнясенску, Беларусі, Уралу, Ніжняга Ноўгараду, Заходняга Сібіру ўключыцца ва Усесаюзную ільняную пераклічку, паставіўшы ў цэнтр работы па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі сваіх раёнаў і сельска-гаспадарчых кампаній 1931 году, трэцяга году пяцігодкі.

Выклікаем увесь абласны і раённы друк пераклічных абласьцей арганізаваць гэту пераклічку на аснове самага шырокага ўнутрыабласнога спаборніцтва раёнаў, сельсаветаў, саўгасаў, колгасаў і устанавіць цеснейшую сувязь паміж газэтамі, колгасамі, саўгасамі, ільнаводчымі абласьцямі і раёнамі, якія спаборнічаюць паміж сабою.

Узяўшы на сябе пачын у арганізацыі ўсесаюзнай пераклічкі, мы, абласныя газэты Заходняй і Ленінградзкай вобласьці, паставілі перад сабой наступныя асноўныя задачы:

Уцягнуць у гэту пераклічку ўсе раённыя газэты ільнаводчых раёнаў, усю армію колгаскораў і селькораў, ільнасаўгасы і колгасы.

Організаваць грамадзкі буксір перадавых раёнаў, сельсаветаў, ільнасаўгасаў і колгасаў над адстаючымі.

Організацыяй сустрэчных пляноў зьнізу забясьпечыць поўнае выкананьне програмы сяўбы лёну.

Організаваць масавы грамадзкі кантроль саміх пасеўшчыкаў—ільнаводаў аднаасобнікаў за выкананьнем самаабавязацельстваў па сяўбе і абавязацельстваў па кантрактацыі ільняных пасеваў праз брыгадныя самаправеркі.

Разгортваем неадкладна шырокую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, сконцэнтраваўшы галоўную сваю ўвагу па організацыйна-гаспадарчым замацаваньні колгасаў, па паўсюдным ўвядзеньні ў іх зьдзельшчыны, на распрацоўцы норм выпрацоўкі, адпаведных фактычнай выпрацоўцы лепшых колгасьнікаў, лепшых колгасных брыгад, на пільным вывучэньні вопыту зьдзельшчыны ў пэрыод сяўбы лёну і зьнішчэньні ўсіх недахопаў пры канчатковым складаньні норм выпрацоўкі на церабленьне лёну, на вывучэньні балянсу рабочай сілы ў колгасах, правільнай яе расстаноўцы і разьмеркаваньні ў працэсе летніх палявых работ, на правільным скарыстаньні жаночае працы ў колгасах, асабліва ў раёнах масавага адыходу, на сваячасовым пуску ільназаводаў.

Ставім пытаньне аб перадачы вырабу абаднога кола ільнацерабілкі Люберэцкім заводам на заводы Ленінграда і бярэм на сябе абавязацельства забясьпечыць пролетарскі кантроль над гэтай справай з тым, каб плян вырабу ільнацерабілак быў выканан цалкам і сваячасова.

Намячаем баявую програму барацьбы за высокія ўраджаі і аўладаньне тэхнікай ільняводства шляхам форсаваньня і набліжэньня вопытнай справы непасрэдна да саўгасаў і колгасаў, організацыі рацыяналізатарскіх груп колгасьнікаў і колгасьніц, правядзеньня асеньніх выставак лёну і г. д.

Заклікаем усе органы друку падхапіць наш пачын, распрацаваць сваю конкрэтную баявую програму дзеяньняў у барацьбе за соцыялістычнае ільнаводства.

Выклікаем Наркомзем СССР, Ільнацэнтр, Галоўпяньком стварыць усесаюзны фонд прэміяваньня ільнаводчых раёнаў, якія пакажуць лепшыя вынікі ў сяўбе і ўборцы ўраджаю лёну 1931 году ў выглядзе дадатковага завозу трактароў, ільнацерабілак, будаўніцтва ільназаводаў.

Выклікаем абласныя і раённыя зямельныя органы ільнаводчых раёнаў, кіруючыя органы колгасна-коопэрацыйнай сыстэмы заняцца распрацоўкай усіх пытаньняў зьвязаных з вырашэньнем проблемы лёну, і забясьпечыць сапраўды опэрацыйнае кіраўніцтва ў правядзеньні чарговых важнейшых задач па пашырэньню ільняных плошчаў, поўнай і сваячасовай ўборцы ўраджаю лёну, паставіўшы на чале сваёй работы організацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў, аказаньне практычнай дапамогі соцыялістычнаму сэктару ільнаводчай гаспадаркі (ільнасаўгасам і колгасам) у выкананьні напружанай програмы сяўбы лёну і яго ўборкі.

Выклікаем усіх спэцыялістых сельскай гаспадаркі, экономістых, плянавых работнікаў уключыцца ў барацьбу за лён, укласьці ўвесь свой вопыт і веды ў справу развіцьця соцыялістычнага ільнаводства.

Выклікаем сельска-гаспадарчыя вопытныя станцыі, навукова-дасьледчыя ўстановы і інстытуты соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі ільнаводчых абласьцей і раёнаў разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва па вывучэньню і распрацоўцы пытаньняў узьняцьця ўраджайнасьці і павышэньня тэхнікі ільнаводства.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне пастаўленых задач магчыма ў тым выпадку, калі будзе забясьпечана з самага-ж пачатку цьвёрдае бальшавіцкае кіраўніцтва „ільнянай пераклічкай", якая разгортваецца, калі партыйныя ячэйкі і партыйныя колектывы саўгасаў, колгасаў, сельсаветаў узначаляць разгортваньне паходу за лён, калі яны забясьпечаць уключэньне ў яго ўсіх орган зацый і сапраўды масавы характар ільнянай пераклічкі, калі будзе праводзіцца настойлівая барацьба з антыільнянымі настроямі, з опортуністычнай недаацэнкай значэньня развіцьця ільнаводства як глыбока гаспадарча-палітычнай проблемы, калі спробам клясавага ворага—кулацтва, якое ліквідуецца на аснове суцэльнай колектывізацыі—сарваць плян развіцьця ільнаводства—будзе дан руйнуючы адпор на ўсёй лініі, з боку ўсіх зьвеньняў партыйных, савецкіх, комсамольскіх, колгасных і іншых організацый ільнаводчых раёнаў.

Дэлегацыя абласнога друку Заходняй вобласьці:

Прадстаўнікі абласных газэт „Рабочий путь", „Соц. деревня". „Большевистский молодняк" і абласной „Радиогазеты" Лібэрман і Насонаў.

Прадстаўнік Аблзу і нам. старшыні Аблільнасаюзу—Гладкоў. Дырэктар Заходняй зональнай вопытнай станцыі лёну—Нікіцін. Старшыня праўленьня колгасу „Вперед к социализму", Рудняньскага раёну—Варэцаў. Старшыня колгасу „Ответ интервентам". Вяземскага раёну—Пятроў.

Прадстаўнікі абласнога друку і організацый Ленінградзкай вобласьці:

„Ленинградская правда" — Левіт. „Крестьянская правда"—Пыткін. „Смена"—Бачкароў, Аблзу—Іост. Аблколгассаюз—Ерамеенка, Аблільнасаюз—Завальнёў. Часопіс „Крестьянская деревня" —Стэрлін.

Комсамольскі суботнік на ільняным заводзе „Кашэна", які пушчан ход 1-га мая.

Барацьбу за лён— на ўдарныя тэмпы

„Чырвоная Зьмена" некалькі раз сыгналізавала аб прарывах у ільназагатоўках па Слуцкім раёне, і ўсё-ж гэтыя сыгналы не пачуты. Праваопортуністычная практыка, адсутнасьць націску на кулацка-заможную частку, нежаданьне загатоўчых організацый перабудаваць сваю працу па-ўдарнаму прывялі да таго, што па раду сельсаветаў гадавы плян ільназагатовак недавыканан на 86 проц. Дарасінскі сельсавет выканаў плян ільназагатовак толькі на 14 проц., Казлавіцкі на 17 проц., Урэцкі на 23 проц.

Даведзеныя цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак ня выконваюцца імі. Па Казлавіцкім сельсавеце цьвёрдае заданьне спагнана ўсяго толькі на 24 проц., па Сераскім на 25 проц.

Выканаць плян ільназагатовак ёсьць усе магчымасьці. Стараўскі сельсавет, які працаваў па-ўдарнаму на ільназагатоўках, гадовы плян выканаў на 172 проц.

Трэба, каб комсамольская організацыя Слуцкага раёну мобілізавала ўсе свае сілы на выкананьне пляну ільназагатовак, мобілізавала шырокія колы колгаснай і працоўнай сялянскай моладзі на барацьбу за лён.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены" Прыбытак

Ударная брыгада комсамольцаў і колгаснай моладзі за прасушкай лёну

Узьняць тэмпы развіцьця ільнаводства

Выходзячы з кліматычных і прыродных умоў, перад сельскай гаспадаркай БССР паўстала задача організаваць буйныя ільнаводныя саўгасы і колгасы.

Да апошніх год былі распаўсюджаны няправільныя думкі, нібы ў буйных соцыялістычных гаспадарках, саўгасах і колгасах, немагчыма разьвіваць лёну, даводзячы гэта тым, што лён вельмі працаёмкая культура, нельга ўстанавіць севазвароту і г. д., а таму лён зьяўляецца культурай выключна дробна-сялянскай.

Будуючы буйную соцыялістычную гаспадарку на падставе індустрыялізацыі і мэханізацыі, мы на практыцы ўшчэнт разьбілі гэту яўна шкодную думку.

Які я-ж магчымасьці мы маем ў 1931 годзе для таго, каб пасьпяхова выканаць ўстаноўленыя ўрадам заданьні, па развіцьцю ільводзтва ў саўгасах і колгасах ільнаводных раёнаў БССР, і як забясьпечваецца сродкамі вытворчасьці вызначаная па пляну на 1931 год засеўная плошча лёну?

Забясьпечанасьць ільнанасеньнем

Усяго для засеву вызначанай плошчы (240.800 га) патрэбна 24.800 тон ільнанасеньня. Выходзячы з разьліку, што насельніцтва будзе мець свайго насеньня 13 тыс. тон, якога хопіць для засеву плошчы, занятай пад лён у 1930 годзе, значыць для прыросту пасеўплошчы неабходна завезьці 11800 тон. Плян завозу забясьпечваецца наступнымі крыніцамі: завозіцца з РСФСР 6500 тон, астаткі ад пасеўкампаніі мінулага году—1100 тон, нарыхтована пасеўнага і адабрана дзеля пасеву з тэхнічнага ільнанасеньня 4200 тон. Такім чынам, патрэбнасьць у ільнанасеньні ў вясновую пасеўкампанію 1931 году цалкам забясьпечваецца.

Забясьпечанасьць мінэральнымі ўгнаеньнямі

Патрэбнасьць саўгасаў ва ўгнаеньні плошчы пад пасевы лёну будзе забясьпечана на 100 проц. Колгасы БССР у сярэднім будуць забясьпечаны на 65 проц., прычым, у ільнаводных раёнах—на 80 проц.

Забясьпечаньне ільнаводных гаспадарак машынамі

Па пляну на 1931 год запроектавана завезьці ў ільнаводчыя раёны для колгасаў і саўгасаў наступную колькасьць ільнаапрацоўчых машын.

Ільнатрашчотак	540	штук
Ільнатрыераў	246	"
Ільняных сяварак	200	"
Лёна-церабілак	691	"
Машын для адчосваньня ільняных галовак	342	"
Ільнацёрак	334	"

Неабходна адзначыць, што некаторыя з паказаных машын завозяцца ў БССР упяршыню: ільняныя сяваркі, машыны для адчосваньня ільняных галовак і ільнацёркі да гэтага часу ня ўжываліся, гэтыя працэсы апрацоўкі лёну былі зусім не мэханізаваны. Ільнацерабілкі ўпяршыню былі завезены ў БССР у колькасьці 27 штук.

Завоз гэтых спэцыяльных машын для ільнаводных колгасаў і саўгасаў уносе карэнныя зьмены ў спосабы вытворчасьці ільна-сыравіны і мэханізуе яе ў значнай меры ўжо у 1931 годзе.

Організацыя М. Т. С.

У 14-ці ільнаводных раёнах ствараe патрэбныя спрыяючыя ўмовы для пашырэньня пасеўных плошчаў лёну за лік асвоеньня новых зямель.

Індустрыялізацыя ільнаводства

У сучасны момант на тэрыторыі БССР працуе два аднатурбінныя заводы па першапачатковай апрацоўцы лёну: у Лёзьне і Дрысе. Акрамя гэтага, будуюцца два двухтурбінныя заводы ў Шклоўскім і Боркавіцкім раёнах, якія павінны быць скончаны у маі—чэрвені г. г.

Разам са значным пашырэньнем пасеўных плошчаў лёну ў ільнаводных раёнах, у 1931 годзе запроектавана і адпаведная сетка ільнаапрацоўчых заводаў. Да першага кастрычніка 1931 году па БССР будзе пабудавана 14 новых двухтурбінных заводаў, 30 новых аднатурбінных і на адным з існуючых заводаў—Лёзьненскім—будзе ўстаноўлена другая швінг-турбіна.

Такім чынам, для апрацоўкі лёну ўраджаю 1931 году на тэрыторыі БССР будзе працаваць 46 заводаў (з іх 15 двухтурбінных і 31 аднатурбінны з 59 швінг-турбінамі, якія апрацуюць амаль усю таварную продукцыю лёну ў ільнаводных раёнах.

Пры 9-ці двухтурбінных ільнаапрацоўчых заводах мяркуецца пабудаваць мачыльныя аддзяленьні, каб прымаць ад пасеўшчыкаў ільна салому, усе астатнія заводы будуць прымаць толькі трэсту (вымачаную, альбо сланую салому).

Паданыя лічбы аб забясьпечаньні ільнаводзтва сродкамі вытворчасьці сьведчаць аб наяўнасьці багатых ўмоў для выканьня вызначанай на 1931 год програмы. Але-ж, ня гледзячы на гэтыя спрыяючыя ўмовы для фарсаваньня тэмпаў развіцьця ільнаводства, мы сустракаемся з выпадкамі опортуністычнай недааацэнкі значэньня ільнаводства ў БССР, з нявер'ем у вызначаныя тэмпы яго развіцьця.

Комсамолу у ільнаводстве трэба адыграць вялікую ролю. Комсамол павінен засукаўшы рукавы ўзяцца за гэту справу, змагацца за пашырэньне ільнаводства, за выкананьне і перавыкананьне плянаў 1931 году, за забясьпечаньне сыравінай тэкстыльнай прамысловасьці. Змагаючыся з шкоднымі настроямі супроць пашырэньня ільнаводства, комсамол пад кіраўніцтвам партыі павінен організаваць шырокія колы моладзі рабочых саўгасаў і колгасьнікаў, стаўшы на чале масавага паходу за лён.

Дзеля таго, каб перамагчы, баец павінен быць узброены па апошняму слову тэхнікі. У даным выпадку комсамол Беларусі павінен узброіцца агротэхнічнымі ведамі яшчэ з большай інтэсыўнасьцю ўступіць у бой за лён, за вядучыя высокатаварныя культуры сельскай гаспадаркі БССР.

М. Г.—і.

У краіну маладую, растучую

(Нататкі з блёк-ноту ў час сустрэчы М. Горкага)

НЕГАРЭЛАЕ. Звычайная станцыя: будынак, абапал чыгуначныя рэйкі. Такіх станцый сотні, тысячы раскіданы на чыгунках Савецкае краіны. Але ад усіх розьніцца Негарэлае. Два шляхі: адзін шырокі, просты—у неабсяжныя прасторы Савецкай краіны; другі вузкі—воддаль станцыі павярнуў у бок,—за мяжу.

* *
*

Сотнямі прагных вачэй затоўп углядаецца ў даль, чакае цягніка. З далёк даляятае грукат колаў, потым абрывісты гудок. Хвіліна,— і грукат цягніка патануў у прывітаньнях і радасных гуках інтэрнацыяналу.

—Глядзі, глядзі, у тое акно... вунь Максімыч!...

—Ёсьць!... прыехаў!...

—Такі-ж самы, як і быў раней!...

Яшчэ не паспеў суняцца цягнік, як Горкі, бадзёры і радасны, акідаючы гордым і пранікнёным поглядам натоўп, павольна выходзіць з вагона. Ен ня шукае знаёмых. Яго ўсе ведаюць, усім знаёмы. Бягуць наперад паглядзець яму ў твар, вітаць яго. Вось ён ідзе з натоўпам, навяроч Серафімовіч, Халатаў, услед: Гладкоў, Усевалад Іванаў, Урыцкі, групы беларускіх пісьменьнікаў, прадстаўнікі партыйна-комсамольскіх і грамадзкіх арганізацый, ударнікі з менскіх прадпрыемстваў. Натоўп, сьціскаючы Максімыча сяброўскім кальцом праводзіць яго да вагона: з акна Максімыч ласкава аглядае сабраўшыхся.

—Аляксей Максімыч! Чырвонасьцяжныя варашылаўцы і асабліва ўдарнікаў брыгад твайго імя дару чылі мне перадаць табе ударнае, баявое прывітаньне. Аляксей Максімыч! Рабочыя прасілі, каб я занёс ніў вас, што мы і надалей пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі будзем ударна змагацца за выкананьне 3-га, рашаючага году пяцігодкі, году завяршэньня пабудовы фундаманту социялістычнай экономікі, а таксама прасілі перадаць на ўспамін вось гэту газэту, з якой мы штурмуем нашы цяжкасьці.

Заметнае хваляваньне, радасьцю палаюць вочы Горкага.

—Дзякую. Малайцы!—паціскаючы руку, адказвае Горкі.

—Аляксей Максімычу—буравесьніку кастрычніцкіх заваёў—баявое чэкіскае прывітаньне!—Ура! Ура!—Вітаюць чырвоныя прымежнікі.

Ня жыцьцё, а сьвята

Максімыч ня можа быць без справы. У часе стаянкі цягніка ён наладжвае гутаркі. Расказвае сабраўшымся аб становішчы ў капіталістычных краінах, ураўжаньні аб социялістычным будаўніцтве ў СССР.

—У Нямеччыне, Італіі і іншых капіталістычных краінах пануе разгубленасьць, няўпэўнасьць у заўтрашні дзень. А тут у нас—у СССР—гэткі ўздым! Я вельмі многа атрымоўваю лістоў ад ударнікаў. Чытаю іх з захапленьнем. Працуюць, будуюць маладцавата, ня гледзячы на цяжкія ўмовы. Тут, у нас—у СССР, ня жыцьцё, а сьвята. Колектыўна людзі твораць дзівы. Больш чым дзівы. Цадумайце, за два гады зрабіць такую „дзяржнавенную" штуку—колектывізаваць больш 47 проц. сялянскіх гаспадарак... Дый наогул мы ідзем... і як ідзем! Як людзей перараждаем! А які гібкі народ,—харошы, малады, на ўсё здольны. Скажам, чытаеш двухкапеечную кніжку, напісаную ўдарнікамі, напісаную проста аб рабоце, жыцьці і перамогах і нехаця дзіву даешся, захапляешся. А гэта яшчэ мы толькі вучымся. Вучыцца нашаму брату ёсьць дзе. Мы жывём у выключны гістарычны пэрыод і, бясспрэчна, наша эпоха з самых ударнікаў высуне такіх мастакоў, такіх масавікоў—пісьменьнікаў, ад кніжок якіх ахне Эўропа.

—А як ваша здароў'е, Максімыч, як адчуваеце сябе.

— Нічога, як бачыце.—здаровы, вясёлы.

— Ці надоўга да нас прыехалі?

— На ўвесь летні пэрыод, і наогул, пакуль будзе дазваляць здароў'е, кліматычныя ўмовы.

— У Крым-бы вам, Максімыч, адпачыць, нехта клапатліва раіць Горкаму.

— У колгасік, Аляксей Максімыч, на адпачынак! А колгасік добры знойдзем,—жартуе адзін з прымежнікаў.—Ня шкодзіла-б,—жартуе Горкі.

— Раскажэце, як жывеце, працуеце?—зьвяртаецца Горкі да чырвонаармейцаў-прымежнікаў.

У дарозе ад Негарэлага да Менску Горкі доўгі час гутарыў з рабочымі ударнікамі менскіх прадпрыемстваў. Гутарыў аб ходзе выкананьня промфінпляну, аб цяжкасьцях социялістычнага будаўніцтва і затым расказаў дадаткова рад яскравых фактаў з жыцьця рабочых капіталістычных краін.

— У жыцьці рабочых Польшчы, Італіі да ўсіх капіталістычных краін нічога няма прывабнага. Расьце з кожным днём беспрацоўе, расьце нездаволенасьць існуючым парадкам. Так, прыкладна, у Італіі, у тэатры зусім нядаўна быў выкінуты лёвунг: далоў Мусоліні! Кепска толькі, што сярод рабочых слаба організавана сіла, няма стройнай моцнай организацыі. Кіраўнікі комуністычных организацый у сваёй

Фота-здымак брыгады Белгоскіно



М. ГОРКІ гутарыць з чырвонаармейцамі прымежнікамі

— Нічога, Аляксей Максімыч! Жывем, Эсэсэраўку ахоўваем.

— А што гэта Эсэсэраўка—карабачка якая?—так далей падтрымаць гутарку пытаецца Горкі.

— Карабачка, на якую ўсе капіталістычныя зубы точаць. Аднак, і мы ня сьпім: тэхніку, Максімыч, усвойваем. Хто з чырвонаармейцаў мотарысты, хто—рацыяналізатар, хто тэхнік. Трох лінейку таксама не забываем. Дапамагаем у рабоце па колектывізацыі. Раён наш маленькі, маем трактарную станцыю, хутка яна будзе мець 250 трактароў, а зараз мае 43. Раён колектывізаваны на 47,5 проц.

— А што сяляне ахвотна ідуць у колгасы?—пытаецца Горкі.

— Да...—хорам, наўперабой адказваюць чырвонаармейцы. Асабліва прыліў у колгасы павялічыўся за час другой бальшавіцкай:

— А як жанчыны?

— Жанчыны не заўсёды ідуць першымі ў колгас, пад час плятуцца ззаду. Як-жа! кароўку, коніка шкода абагульваць, разважаюць...

— Толькі не паклёпнічайце на жанчын. Мы ідзем у ногу з мужчынамі.

— Нашы байцы, Аляксей Максімыч, зьяўляюцца ўдарнікамі. Хочам быць прыкладам для ўсёй вайсковай акругі. Каб быць добра падрыхтаванымі. Ваяваць мы ня хочам. Ну, а калі ўжо, Максімыч, і стукнем, дык стукнем! Як Будзёны казаў: стукнем, каб аж скула лопнула.

— А без вайны не абыйсьціся, не пражыць,—робіць сваю заўвагу Горкі.

Жывая, захапляючая гутарка працягвалася-б мабыць яшчэ надзвычайна доўга, каб ня трэ' было адыходзіць цягніку.

бальшавіцкі арыштаваны, сядзяць у турмах. І пяць даўва: на 500 рабочых—70 провакатараў.

Вялікае ўражаньне на рабочых Італіі зрабілі ўдарнікі Абхазіі ў часе экскурсіі. Праўда ўражаньне гэта нельга было інакш адкрыта выразіць, як толькі моцным пацісканьнем рук.

— Ці с пышіла буржуазія траўлю супроць вас.

— Гэта ня мае ніякага дачыненьня. Я на гэта не зьвяртаю ўвагі. Мала, што нейкі там дурань з Нямеччыны напісаў, а буржуазная прэса падхапіла. Для мяне прыемна і радасна тая ўвага, якая была аказана мне працоўнымі СССР у многатысячных протэстах. Я ў прыватнасьці атрымаў больш 200 тэлеграм.

— Мы, вас Аляксей Максімыч, нікому у зьнявагу не дамо, адказвае ўдарніца.

Кашаль у Горкага раз-по-раз абрывае размову.

Цягнік ліхаманкава імчыцца. Пад'яжджаем да Менску. Тысячная калёна пролетарыяў-ударнікаў Менску з оркестрам, плякатамі спаткала прыезд свайго любімага пісьменьніка Максіма Горкага. Кароткі мітынг. Ад імя пролетарыяту і працоўных СССР Горкага вітае тав. Будзінскі.

— У асобе Горкага мы вітаем першага пролетарскага пісьменьніка нашай краіны. Які вырас з нашага асяродзьдзя, які паходзіць плоцьцю і крывёю ад рабочае клясы. Зараз, калі капіталістыя пры дапамозе соцыял-фашыстых рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР, Горкі зусім правільна выкрываючы іх замыслы, на-баявому заклікае працоўных ўсяго сьвету выступіць на абарону бацькаўшчыны пролетарыяту. Вось чаму кожны прыезд Максіма Горкага ў СССР мы спатыкаем як сьвята.

А. С.

На пленуме праўленьня БелАПП'у

12 мая ўвечары распачаў працу другі пашыраны пленум БелАПП з удзелам прадстаўнікоў рабочых-ударнікаў, заклікан͏ых у літаратуру і БелАПП. На першым вячэрнім пасе-джаньні пленум заслухаў політычны даклад тав. Будзінскага, які ў сваім дакладзе асьвятліў пытаньні міжнароднага становішча і падрабязна застанавіўся на задачах, што стаяць зараз на літаратурным фронце.

На ранішнім пасяджэньні 13 мая пленум заслухаў справаздачу сэкратарыяту БелАПП. Дакладчык тав. Ліманоўскі адзначыў, што БелАПП за апошні час дабіўся вялізарных посьпехаў ў барацьбе за гегемонію пролетарскай літаратуры.

— Сёньня асабліва выразна,—гаворыць тав. Ліманоўскі, акрэсьліваецца роля БелАПП'у, як вядучага атраду ўсёй савецкай літаратуры БССР.

БелАПП правёў рашучую барацьбу з беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам. Дакладчык падрабязна спыняецца на пытаньнях гэтай барацьбы.

Посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва і пролетарскага сэктару савецкай літаратуры за апошні час значна паглыбілі дыфэрэнцыяцыю на літаратурным фронце, а таксама і ўнутры БелАПП.

Ёсьць прыклады набліжэньня да нас, набліжэньня да пролетарскай літаратуры. Гэтае набліжэньне папутнікаў адбываецца неаднакова. Тав. Ліманоўскі прыводзіць прыклады гэтых спроб набліжэньня і называе імёны па утнікаў: Лужаніна, Глебкі, Кузьмы Чорнага і інш. з „Узвышша", якое раней, на працягу значнага часу выконвала фактычна соцыяльны заказ беларускіх нацдэмаў. Цяпер ужо наглядаецца некаторае супрацаваньне БелАПП'у з літаб'яднаньнем „Узвышша".

Ня гледзячы на бясспрэчны рост пролетарскай літаратуры, усё-ж яшчэ наглядаецца значнае адставаньне БелАПП у яго творчай і грамадзка-культурнай рабоце ад тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Перад БелАПП цяпер паўстае цэлы рад задач, вырашэньне якіх дапаможа ліквідаваць гэтае адставаньне.

Для таго, каб ліквідаваць гэтае адставаньне, патрэбна значна паскорыць перабудову радоў БелАПП. Галоўнейшым стымулам для гэтай перабудовы зьўляецца ажыцьцяўленьне лёзунгу „рабочы-ударнік—у літаратуру". Між тым, заклік ударнікаў у літаратуру праходзіць нездавальняюча. Шэраг організаваных літгурткоў працуюць, распаліся. БелАПП яшчэ ўцягнуў усю сваю масу пісьменьнікаў у работу па закліку ударнікаў у літаратуру.

Тав. Ліманоўскі адзначае канечную патрэбу дабіцца адзінства радоў Бел-АПП, узьняць на вышэйшую ступень адказнасьць кожнага белаппаўца, уцягнуць кожнага з іх у непасрэдны, канкрэтны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве забясьпечыць актыўны ўдзел у рабоце літгурткоў шырэй разгарнуць творчую дыскусію і інш.

Дакладчык адзначае, што цэнтральныя газэты за апошні час нездавальняюча асьвятляюць на сваіх старонках пытаньні барацьбы на літаратурным фронце. Асобна дакладчык гаворыць аб „Чырв. Зьмене", якая адыгрывае значную ролю ў літаратурным жыцьці і якая цяпер, да пленуму прад'явіла БелАПП'у комсамольскі рахунак. „Ч. З." зьяўляецца, заявіў дакладчык, дапаможнікам БелАПП.

Дакладчык асабліва падкрэсьліў на неабходнасьць упартага і паслядоўнага ажыцьцяўленьня політыкі партыі на літаратурным фронце.

Пленум віталі ад імя ФОСП і РАПП тав. Серафімовіч, ад ЛОЧАФ РС... тав. Матэ Залка, ударнік, заклікан... літаратуру, рабочы заводу „А... тав. Салоў.

Выступіўшы ў спрэчках па справаздачы сэкратарыяту БелАПП т. Ж...кевіч (Віцебская філія) адзначыў... значным клясава-ідэёвым росьце Бел-АПП.—Ад заклікаў да сфінксу, ся... нашай філіі пачалі апяваць героі... соцыялістычнае будаўніцтва,—гаворыць т. Жыткевіч.

Тав. Вярнікоўскі перадаў пленуму прывітаньне ад „Чырвонай Зьмены" і завастрыў увагу ўдзельнікаў пленуму на пытаньнях комсамольскай тэматыкі пролетарскай літаратуры, ... біцця ў літаратуры героічнай барацьбы комсамолу на франтох пяцігодкі.

Пасьля выступленьня тав. Чарнушэвіча ранішняе пасяджэньне было скончана. Прамова т. Чарнушэвіча будзе падана ў наступны № „Ч. З."

* *
*

На вячэрнім пасяджэньні 13 мая працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Ліманоўскага. У спрэчках выступілі т. т. Ржэўскі, Даніловіч (АБВШ), Хаткевіч (Полацак), Працька (цэнтр. літстудыя), Розэнблюм (Гомель), Мазуркевіч), Знаёмы (МенАПП), Богуш АБВШ), Жукоўскі (БабрАПП), Вараб'ёў Шэўчык, Кацовіч (рабочы-ударнік, заклікан͏ы ў літаратуру), Мысьлінскі (польсэкцыя (БелАПП), Мурашка („Маладняк"), Кучар (МенАПП) і Я. Маўэр.

Увечары пашыраны пленум БелАПП організаваным парадкам прыбыў на вокзал, дзе разам з пролетарскай моладзкасьцю Менску сустракаў Максіма Горкага.

Учора зранку ў спрэчках па справаздачы сэкратарыяту выступілі т. Броншэйн (яўсэкцыя БелАПП), Галавач, Гальперына. На гэтым ранішнім пасяджэньні пленум заслухаў заключнае слова т. Ліманоўскага і даклад т. Каваленка аб творчай дыскусіі ў РАПП.

„ВЯЛІКАДУШНЫ" СУД КАРАЦЕЛЯЎ

ЛЁНДАН, 10. Як паведамляюць з Рангуна (Бірма), у спэцыяльным трыбунале разглядалася справа абвінавачаных у паўстаньні ў акрузе Пайепон у студзені. Прызнаўшыяся падсудныя прыгавораны да сьмерці, 56—да пажыцьцёвай высылкі.

Судзьдзя, выносячы прыгавор, заявіў, што дзейнічае „вялікадушна" ў адносінах да падсудных.

Карная экспэдыцыя ў акрузе Пром у Бірме ў час сутычкі з паўстанцамі ўзяла ў палон 14 чалавек. Забіта 21.

„Сьмерць тым, хто страляе ў нас"

ПАРЫЖ 11.—10-га мая ўвечары у Мадрыдзе перад будынкам рэдакцыі монархічнай газэты „АБЦ" адбылася дэмонстрацыя, у якой удзельнічала больш 10-ці тысяч чалавек. Дэмонстранты крычалі: „Сьмерць грамадзянскай гвардыі, якая страляла ў нас"

Некалькі дэмонстрантаў мелі пры сабе газ у біддонах.

Стратэгічныя пункты Мадрыду заняты буйнымі поліцэйскімі сіламі. Дэмонстранты напалі на былых міністраў Матос і Санчэс-Гера, выходзіўшых з монархічнага сходу. Рэформісцкія профсаюзы і соц-фашысцкая партыя прапанавалі рабочым разыйсьціся. К палове 1... гадз. лік дэмонстрантаў усё яшчэ павялічваўся.

Сутычкі паміж монархічнай моладзьдзю і рэспубліканцамі

ПАРЫЖ. 10.—Па паведамленьню агенства Гавас, у Мадрыдзе пасьля сходу, прысьвечанаму склікаваньню ўстаноўчага сходу, паміж монархічнай моладзьдзю і рэспубліканцамі пачаліся жорсткія сутычкі.

Рэспубліканцы падпалілі тры аўтамабілі монархістых, у тым ліку аўтомобіль пісьменьніка монархічнай газэты „АБЦ".

Пасьля беспасьпяховых імкненьняў суняць стычкі, поліцыя арыштавала шмат монархістых і пасадзіла іх у турэмную карэту для адпраўкі ў турму. Аднак праціўнікі монархістых заўладалі карэтамі, каб расправіцца з монархістымі, якія ў іх сядзелі.

Фінляндзкія фашыстыя баяцца выкрыцьцяў

ГЕЛЬСІНГФОРС. Па паведамленьнях газэт, учора ўночы ляпуасцамі (фашыстымі) выкрадзен з сваёй кватэры былы рэдактар фашысцкага органа „Актывісты"—Ківінэн, які апублікаваў на днях у газэце „Турн Саномат" выкрыцці з прычыны дзейнасьці ляпуасцаў. Ляпуасцы апранулі Ківінэна ў чырвоную кашулю і каўпак і адвязьлі яго ў Ляпуа.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599